# СЕКЦИЯ КУЛЬТУРОЛОГИИ, РЕЛИГИОВЕДЕНИЯ, ФИЛОСОФИИ

УДК 621.161.3-155*А.Волан

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ФІЛАСОФІЯ АНДРЭЯ ВОЛАНА Ў ВЕРШЫ "ДА ПАЛЯКАЎ І ДА ЛІЦВІНАЎ"

***Я. Д. Алейнікаў*** (ГДУ імя Ф. Скарыны)
Навук. кір. ***В. А. Міхедзька***,
канд. гіст. навук, дацэнт

Верш Андрэя Волана "Да палякаў і да ліцвінаў" змешчаны ў кнізе Аўгусціна Ратундуса "Размова паляка з ліцвінам", выдадзенай брэсцкім друкаром Цыпрыянам Базылікам у 1564-1565 гг. Прыведзенае выданне з`яўляецца палемічным адказам на "Піраміды" польскага філосафа Станіслава Ажахоўскага, у якіх адстойвалася думка аб неабходнасці далучэння "нявольнікаў"-ліцвінаў да Польшчы [1, с. 135-136].

У першую чаргу Волан падкрэсліваў прадуктыўнае і раўнапраўнае суіснаванне продкаў тагачасных ліцвінаў і палякаў, што выяўлялася ва ўзаемнай павазе, агульным вырашэнні спраў і падначаленасці аднаму ўладару. Такога кшталту саюзы, на думку А.Волана, памнажаюць багацце яго ўдзельнікаў. Аўтар канстатаваў, што "роўны з роўным змірыцца здолее заўседы". Далей паэт асуджаў пагарадлівае стаўленне палякаў да ліцвінаў, падкрэсліваў, што гнет, абразы, хлусня і двудушнасць не прывядуць да згоды. Падобная пыха палякаў, па меркаванню творцы, была шляхам да разладу і ўнутры польскага грамадства. Волан выступаў супраць прынцыпа: "Брату – хвост, а самому мала цэлай скуры". Аднак паэт разумеў, што ў тых абставінах не было віны ўсіх палякаў, а толькі тых прадстаўнікоў Кароны, што наўмысна распальвалі канфлікт паміж народамі. Да іх, на думку А.Волана, належыў і Ажахоўскі, што ствараў байкі пра "нявольных" ва ўласнай дзяржаве літвінаў і прапаноўваў ім "вызваленне" ў далучэнні да Польшчы. У канцы твора Волан зычыў палякам дабіцца волі, а не анархічнага свавольства, што, "як кабыла, тлусцела ад распуснай долі". А. Волан звяртаўся да абодвух народаў з заклікам з`яднацца дзеля захавання дзяржаўнасці "бо распуста ўсе царствы на свеце сплюндравала" [2, с. 516-517].

Такім чынам, грамадска-палітычная філасофія А. Волана ў вершы "Да палякаў і да ліцвінаў" зводзілася да сцвярджэння таго, што толькі раўнапраўныя і ўзаемапаважлівыя саюзы спрыяюць узмацненню і росквіту дзяржаў-удзельніц, да чаго павінны памкнуцца як палякі, так і ліцвіны.

**Літаратура**

1. **Кавалеў, С.** Шматмоўная паэзія Вялікага Княства Літоўскага эпохі Рэнесансу : манаграфія / С. Кавалеў. – Мінск : Кнігазбор, 2010. – 376 с.

2. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – XVIII стагодддзя / А. І. Богдан [і інш.]. – Мінск: Бел. навука, 2005. – 1015 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова